# Belarusian A: literature – Standard level – Paper 1
# Biélorusse A : littérature – Niveau moyen – Épreuve 1
# Bielorruso A: literatura – Nivel medio – Prueba 1

Wednesday 10 May 2017 (afternoon)
Mercredi 10 mai 2017 (après-midi)
Miércoles 10 de mayo de 2017 (tarde)

1 hour 30 minutes / 1 heure 30 minutes / 1 hora 30 minutos

---

### Instructions to candidates

- Do not open this examination paper until instructed to do so.
- Write a guided literary analysis on one passage only. In your answer you must address both of the guiding questions provided.
- The maximum mark for this examination paper is **[20 marks]**.

### Instructions destinées aux candidats

- N'ouvrez pas cette épreuve avant d'y être autorisé(e).
- Rédigez une analyse littéraire dirigée d'un seul des passages. Les deux questions d'orientation fournies doivent être traitées dans votre réponse.
- Le nombre maximum de points pour cette épreuve d'examen est de **[20 points]**.

### Instrucciones para los alumnos

- No abra esta prueba hasta que se lo autoricen.
- Escriba un análisis literario guiado sobre un solo pasaje. Debe abordar las dos preguntas de orientación en su respuesta.
- La puntuación máxima para esta prueba de examen es **[20 puntos]**.

2217 – 0019



© International Baccalaureate Organization 2017

Напішыце літаратурны аналіз толькі **аднаго** з двух дадзеных тэкстаў. У сваім аналізе Вы мусіце адказаць на абодва накіравальныя пытанні.

**1.**

Можа, і не такія далёкія ад сапраўднасьці былі нашыя продкі, калі верылі ў галоўнага бога Рода як жывую існасьць, якая няспынна ўтвараецца зь людзкіх душаў, што адляцелі да зорак. І глядзяць зь нябёсаў зоркі—вочы дзядоў нашых, мудрых, якім нарэшце ўдалося спазнаць Сусьвет. Сочаць яны за намі, дапамагаюць, накіроўваюць думкі і дзеяньні нашыя, каб ня даць разысьціся нам як народу сярод гістарычных віхураў.

Так і я ў думках сваіх і малітвах заўсёды зьвяртаюся да дзядоў. Парады прашу ці дапамогі. І ўсё гэта вельмі канкрэтна для мяне, бо так ужо склаўся лёс, што шмат маіх блізкіх — родзічаў і сяброў — ужо там, сярод зорак. Можа хто й не паверыць, але сапраўды, часам атрымліваю ад іх падтрымку, парады ды адказы на пытаньні. [...]

Акурат той самай парою Віялета Кавалёва прынесла на нашыя штотыднёвыя вячоркі словы гэтай даўняй песьні: «Вельмі яна традыцыйная і распаўсюджаная, варта развучыць». Песьня ўсім вядомая — «За туманам нічога ня відна...» Аднак словаў яе я так да канца ніколі і ня чула — ці можа, не задумывалася ніколі. А як пачала сама сьпяваць, дык міжволі кожнае слова асэнсоўваю. І зазначаю сабе дзіўнасьць гэтай песьні, нейкую непасьлядоўнасьць і нестыкоўку ў сюжэце — у парушэньне фальклёрных канонаў. Ці то лірычная яна, ці баладная? (Гэта ж некалі яшчэ студэнткай філфаку займалася я фальклярыстыкай...) Але ж якой журбой дыхае з гэтага радка: «Упусьціла залато вядзерца...»! Хаця, здавалася б, чаго ўжо так было бедаваць па нейкім там начыньні?

І тут раптам нехта зь дзяўчат: «А чаму вядзерца?» — «А сапраўды! Чаму ж ня больш паэтычна — пярсцёнак ці ручнік?». Завялі дыскусію, якую проста і лягічна падсумавала Віялета: «Напрыканцы, «вядзерца» добра рыфмуецца з «сэрцам»!

На тым і пагадзіліся... Вось толькі — а «сэрца» самое тут навошта? Ой, не! Нешта ня ўсё тут так проста! Вучылі нас калісьці, перад студэнцкай фальклорнай практыкай, каб ані слова, ані літары ў запісваных творах не зьмянялі, бо ўсё ў народнай паэзіі да месца, усё мае сваё значэньне. Як у арнамэнце кожны кручок невыпадковы, так і ў песьні — кожнае слова. А тут — з логікай нішто не сябруе! ...Вось толькі пачуцьці песьня ва ўсіх выклікае аднолькавыя: тугу ды смутак. І яшчэ чамусьці сьпяваць яе хочацца, вось і мармычам цэлымі днямі.

Недзе праз тыдзень падыходзіць да мяне Надзя Дробіна — і зноў пра песьню: «Такая ж жаласьлівая, як і ўсе нашыя...» Ды што ж гэта такое! І табе яна з галавы ня йдзе? — Пярэчу, што ня ўсе ж у нас такія, дастаткова і вясёлых, і жартоўных. Гэта ж у гэтай нешта такое, што нам так сэрца сьціскае...

Праз хвіліну—другую ізноў Надзя да мяне: «Слухай, я тут усё пра сэнс гэтай песьні думаю. Гэта ж трэба такая меркантыльнасьць: хто вядзерца маё дастане, за таго й замуж пайду, раз яно ўжо такое залатое... Ну, так?» ...Вось далося нам гэтае вядзерца! «Надзейка, ну адкуль у нашых дзяўчат вёдры залатыя ўзяліся б?» (Так, было Вялікае Княства Літоўскае казачна багатай дзяржавай, але не да такой жа ступені!) ...А сапраўды, чаму яно менавіта залатое? — «Не, Надзейка, «залатое вядзерца» тут — нейкі вобраз, сымбаль...»

Вось толькі які? Нідзе, ніколі не сустракала такога. Нават у той кніжцы пра арнамэнт — там якіх толькі сымбаляў няма: і вазоны, і пчолы, і нават рогі. А вядзерца не прыгадваецца... А дзе ж яго знайсьці? Як зразумець гэтую песьню дзіўную, што спакою нам не дае? Яна, пэўна, уся на вобразах пабудаваная. А сэнс іхны даўно ўжо забыты...

І зноў я думкамі да дзядоў: ну, што вы тут наскладалі, што мы ніяк уцяміць ня можам? Давайце дапамагайце...

У наступную ж ноч на досьвітку бачу я сон: вось ідзем мы зь сябрамі па вуліцы нейкага канадыйскага гарадка. І раптам бачым: сярод крамаў — хата, як наша вясковая,

на ёй шыльда вялізная «Беларускія вырабы». Засьпяшаліся мы ў сярэдзіну. А там усё наскае, роднае. І бабулька старэнькая выходзіць да нас і кажа: «Даўно ўжо вас чакаю!» Абняліся мы зь ёю. Раптам я і пытаюся: «Бабулечка, дык а што ж гэта такое — «залатое вядзерца»? А яна і адказвае: «А «залатое вядзерца» — гэта тое, што адыходзіць ад нас і ніколі ня вернецца». І ўсё, і зьнікла. ...Толькі думкі мае закружыліся, пабеглі. І як быццам з зорак гаснучых ляцяць да мяне прамяні—думкі, пераплятаюцца з маімі, успыхваюць іскрынкамі—адказамі на мае пытаньні (кажуць, тэлепатыя!).

...Адыходзіць? ...Што ад нас «адыходзіць»? — Маладосьць... каханьне... радзіма... Ага, радзіма! «Упусьціла залато вядзерца» — згубіла радзіму! Згубіла тое, чым чэрпала жыцьцёвую сілу з гаючых крыніц. І сама «крыніца» — гэта вядомы ўсім вобраз зямлі нашай.

Згубіла радзіму... А чаму? Дзе гэта яна апынулася: за «туманам», «ярам», «даліною»? — А гэта ж за стэпам. ...Дык у палоне! [...]

Ну, а «казак маладзенькі»? — Дык гэта ж яе жаніх... [...] «Узваўся» ён «дастаць вядзерца». Ага, вызваліць з палону! [...]

Дый казак ня просты быў хлапец. Нездарма «казак» — вольны, значыць. Шляхціц ці князь. І дзяўчына была, відаць, князёўна. І былі гэта канкрэтныя людзі з канкрэтнымі імёнамі. І была гэта сапраўдная гісторыя, пра якую нехта склаў баладу. Людзі сьпявалі, а зь цягам часу канкрэтныя вобразы замяніліся на больш ёмкія, дасьціпныя, абагуленыя. І да нас гэтая гісторыя дайшла ўжо звычайнай лірычнай песьняй.

Ірына Варабей, *Там, дзе сэрца маё* (2005)

(а) Якія тэмы раскрывае аўтар і як яны пераплецены ў гэтым фрагменце?

(б) Растлумачце, якія стылістычныя прыёмы і мастацкія вобразы ўжывае аўтар і з якой мэтай.

**2.**

**Мы чакалі Калядаў з маленства…**

Мы чакалі Калядаў з маленства
І ніяк не маглі дачакацца
Тату трэба было на работу
Маці трэба было на працу

А Гагарын ляцеў на ракеце
Па-над нашым дваром ды садам
Мы глядзелі ўсьлед са зьдзіўленьнем
І міжволі чакалі Калядаў

Мы ўвосень падпальвалі лісьце
Мы ўзімку хварэлі на глянды
І прыклаўшы далоні да вуснаў
У цямрэчы чакалі Калядаў

Мы пісалі ў школе дыктоўкі
Нас вадзілі глядзець на парады
Прафсаюз выдаваў карамэлькі
Мы бралі і чакалі Калядаў

Нам даводзілі, хто мы і што мы
Нас вучылі выконваць загады
Нам казалі, ды мы ня чулі
Мы ўпотай чакалі Калядаў

Мы рабілі высновы хутка
Мы павольна сьпявалі баляды
Мы назлосьць валасы расьцілі
І ўпарта чакалі Калядаў

Што з таго, што ўсё гэта зьнікла
Быццам бурбалкі ад ліманаду
Засталіся сям’я і дзеткі
Засталося чаканьне Калядаў

Засталіся сябры ды праца
А адзін, дык «вабшчэ» ў Канадзе
Мы на сьвяты дашлем паштоўку
Будзем разам чакаць Калядаў

Позна ўвечары посуд памыем
І пакінем, каб сохнуў на тацы
Мы чакаем Каляды з маленства
І ня можам ніяк дачакацца

Міхал Анемпадыстаў, *Глыбока-глыбока, на дне філіжанкі кавы* (2013)

(a) Што вы можаце сказаць пра цэнтральныя тэмы верша і пра ролю вобраза Калядаў у раскрыцці гэтых тэм?

(б) Якія мастацкія сродкі і вобразы, а таксама іншыя стылістычныя прыёмы выкарыстоўвае аўтар у прэзентацыі галоўных ідэй верша і з якой мэтай.